УДК 378:811.161.3

*А. М. Шубадзёрава*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
*(Беларусь)*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ФОРМ КААПЕРАТЫЎНАГА НАВУЧАННЯ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

*У артыкуле аналізуюцца асаблівасці кааператыўнага навучання. разглядаюцца прынцыпы і формы сумеснай работы, прыведзены прыклады прымянення гэтай тэхналогіі на практыцы. Адзначаецца, што кааператыўныя формы навучання садзейнічаюць павышэнню вучэбна-пазнавальнай актыўнасці студэнтаў, развіваюць маўленне, камунікатыўнасць і мысленчую дзейнасць.*

Сучасны этап развіцця грамадства прад’яўляе новыя патрабаванні да падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, якія павінны валодаць не толькі грунтоўнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, але і «ажыццяўляць маўленчую камунікацыю ў прафесійнай дзейнасці; працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні, праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да змен ў прафесійнай дзейнасці» [1, с. 4–5]. Дасягненню пастаўленых мэт будзе садзейнічаць выкарыстанне ў адукацыйным працэсе сучасных метадаў і падыходаў у выхаванні і навучанні, інавацыйных тэхналогій, накіраваных у першую чаргу на фарміраванне камунікацыйных навыкаў і ўменняў.

Нельга не пагадзіцца з меркаваннем, што для традыцыйнай формы навучання характэрны аднабаковы спосаб камунікацыі, пры якім «выкладчык транслюе інфармацыю, а студэнт яе ўспрымае і затым узнаўляе. Аднабаковая камунікацыя характэрна і для семінарскіх заняткаў, на якіх не выкладчык, а студэнт транслюе некаторую інфармацыю» [2, с. 216]. Безумоўна, акрамя дадзенай формы камунікацыі, патрэбны і іншыя спосабы фарміравання маўленчай кампетэнцыі, якія б прадугледжвалі актыўнасць усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу, давалі б большую магчымасць для камунікатыўных зносін паміж студэнтамі, дазвалялі б ім выказваць свае ўласныя меркаванні, дзяліцца ведамі і вопытам, набытымі ў працэсе навучання. Бо, як справядліва адзначае В. А. Сімховіч, «студэнты лепш вучацца і авалодваюць пэўнымі ўменнямі, калі яны выкарыстоўваюць уласны вопыт, а выкладчык актыўна падтрымлівае іх спосаб навучання, заахвочваючы меркаванні студэнтаў, якія не супадаюць з яго ўласным пунктам гледжання» [2, с. 216].

Для рэалізацыі вышэйназваных патрабаванняў неабходны новыя педагагічныя падыходы. Эфектыўнымі ў гэтых адносінах, на нашу думку, будуць прыёмы і формы кааператыўнага навучання. Кааператыўнае навучанне звычайна разглядаецца як педагагічная методыка, якая ўключае набор метадаў, якія выкарыстоўваюцца ў пэўнай паслядоўнасці для рашэння пастаўленай вучэбнай задачы.

Методыка кааператыўнага навучання не з'яўляецца новай, яна актыўна пачала распрацоўвацца яшчэ ў 70-ыя гады XX стагоддзя. У яе аснове ляжаць ідэі, прапанаваныя амерыканскімі вучонымі Р. Славіным, Р. Джонсанам, Д. Джонсанам, Дж. Арансанам. Безумоўна, нельга абмінуць увагай навуковыя працы С. Кагана, які працягнуў даследаванні па дадзенай праблематыцы. Ён не толькі абагульніў вопыт сваіх папярэднікаў, але і распрацаваў цэлую канцэпцыю прыёмаў кааператыўнага навучання, якія з поспехам выкарыстоўваюцца ў розных навучальных установах свету.

Сістэма кааператыўнага навучання грунтуецца на наступных узаемазвязаных прынцыпах:

- Дасягненне поспеху ў працэсе сумеснай работы. Неабходна так арганізоўваць заняткі, каб кожны навучэнец адчуваў адказнасць за калектыўны вынік вучэбнай групы, быў зацікаўлены ў тым, каб кожны яе ўдзельнік засвоіў вучэбны матэрыял. Для гэтага выкарыстоўваюцца розныя тэхнікі: выстаўленне агульнай адзнакі, падзел матэрыялу паміж членамі групы і г. д.
- Дасягненне агульнай мэты на аснове ўліку індывідуальнай работы кожнага ўдзельніка, які ўносіць свой пасільны ўклад у групавы вынік. Гэта дасягаецца індывідуальным тэсціраваннем (і ацэньваннем), наяўнасцю абавязковага індывідуальнага задання, якое выконвае кожны ўдзельнік.
- Асабістае ўзаемадзеянне з мэтай дапамогі і падтрымкі. Выкладчык так арганізоўвае камунікацыю ў групе, каб навучэнцы вучыліся падтрымліваць і стымуляваць адзін аднаго.
- Супрацоўніцтва з мэтай развіцця сацыяльных навыкаў. Сацыяльная кампетэнцыя мае значэнне там, дзе людзі супрацоўнічаюць адзін з адным. Задача выкладчыка заключаецца ў тым, каб навучыць студэнтаў узаемадзейнічаць, пры гэтым улічваць трэба як унутрыасабістыя аспекты, так і групавыя. Фарміраванне навыкаў камунікацыйнага супрацоўніцтва немагчыма без умення прымаць рашэнні, вырашаць канфлікты, ствараць абстаноўку даверу.
- Наяўнасць дастатковай колькасці часу для калектыўнай працы: групавое выкананне заданняў займае больш часу, навучэнцы паступова асвойваюць калектыўныя віды працы, адмаўляючыся ад найменш эфектыўных.

Пры рэалізацыі вышэйназваных прынцыпаў ствараецца добрае асяроддзе для навучання ў супрацоўніцтве і развіваецца магчымасць сумеснай камунікацыі

для студэнтаў. Як адзначаюць прыхільнікі дадзенай тэхналогіі, выкладчыку адводзіцца важная роля ў навучальным працэсе — роля арганізатара самастойнай вучэбна-пазнавальнай, камунікацыйнай, творчай дзейнасці студэнтаў, і ён становіцца паўнапраўным удзельнікам навучальнага працэсу [3, с. 137].

Кааператыўнае навучанне ўключае ў сябе некалькі абавязковых этапаў:

1) падрыхтоўчы этап (вызначэнне тэмы і мэт заняткаў, сістэмы перадачы інфармацыі і каардынавання дзейнасці навучэнцаў, колькаснага складу рабочых груп; размеркаванне студэнтаў па групах);

2) практычны этап (размеркаванне заданняў, устаноўка часу на іх выкананне, пошук і аналіз інфармацыі, арганізацыя міжгрупавога супрацоўніцтва;

3) прэзентацыйны этап (прэзентацыя вынікаў дзейнасці, абмеркаванне і падвядзенне вынікаў работы групы);

4) ацэначны этап.

Кааператыўны метад навучання можа быць рэалізаваны ў розных формах: навучанне ў камандах дасягненняў, «піла», «вучымся разам», трохступенчатае інтэрв’юіраванне, нумерацыя студэнтаў, метад каманднай падтрымкі індывідуальнага навучання і інш., якія былі падрабязна апісаны ў навукова-метадычнай літаратуры [4].

Мы хацелі б спыніцца на некаторых з іх і прадэманстраваць, як яны могуць быць выкарыстаны на занятках па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)».

У першую чаргу неабходна звярнуць увагу на метад каманднай падтрымкі індывідуальнага навучання. Сутнасць гэтага метаду заключаецца ў тым, што малыя групы маюць магчымасць выконваць прапанаваныя заданні ў індывідуальным тэмпе. Трэба адзначыць, што гэты метад з’яўляецца найбольш эфектыўным пры вывучэнні тэмы «Лексічная сістэма беларускай мовы», у прыватнасці пры знаёмстве з беларускай тэрміналогіяй.

Заняткі з выкарыстаннем дадзенага метаду арганізуюцца наступным чынам. Папярэдне выкладчык фарміруе малыя групы па 3-4 чалавекі. Падзел на групы можа адбывацца па адным з трох прынцыпаў: выпадковага ці свабоднага выбару (па жаданні навучэнцаў) або дырэктыўна (па волі настаўніка). Для вывучэння тэрміналагічнай лексікі мэтазгодна ў адну групу аб’яднаць навучэнцаў з розным узроўнем падрыхтоўкі, у кожнай групе прызначыць кансультанта, які дапаможа вырашыць цяжкія ці спрэчныя пытанні і будзе падтрымліваць сувязь з выкладчыкам.

Загадзя трэба паклапаціцца пра тое, каб навучэнцы зручна адчувалі сябе падчас сумеснай працы, бо яны павінны кантактаваць у працэсе сумеснай дзейнасці, г. зн. бачыць адзін аднаго; падрыхтаваць матэрыялы, неабходныя для работы: падручнікі, слоўнікі, рабочыя лісты з заданнямі для кожнай групы,

даведкавыя і дапаможныя матэрыялы. Перад выкананнем заданняў абавязкова нагадаць правілы групавой працы, якіх трэба прытрымлівацца, і крытэрыі ацэнкі кожнага задання і групы ў цэлым.

Пры падрыхтоўцы заданняў неабходна звярнуць увагу на тое, што знаёмства з юрыдычнымі тэрмінамі ўключае некалькі этапаў: 1) азнаямленне з лексічнай адзінкай (гукавое і графічнае афармленне, семантыка, граматычныя прыметы), 2) засваенне (замацаванне ў памяці навучэнцаў) і 3) выкарыстанне тэрміна ў маўленні. На кожным з гэтых этапаў выкарыстоўваюцца розныя віды практыкаванняў.

Для азнаямлення з тэрмінамі можна прапанаваць зрабіць пераклад слоў з рускай мовы на беларускую, прычым кожны навучэнец павінен самастойна выканаць частку агульнага задання (перакласці 2-3 словы) і падзяліцца вынікамі сваёй працы з астатнімі. Для лепшага запамінання тэрмінаў зручна выкарыстоўваць карткі, з аднаго боку якіх запісаны тэрмін на рускай мове, а з другога — на беларускай. Для фарміравання арфаграфічных навыкаў карыснымі будуць такія заданні, як уставіць у словах прапушчаныя літары, знайсці памылкі ў напісанні тэрмінаў. Такія заданні пажадана выконваць разам, у працэсе іх выканання навучэнцы могуць звяртацца адзін да аднаго за парадай, дапамогай, яны могуць правяраць працы адзін у аднаго, дапамагаць выпраўляць дапушчаныя памылкі, кансультавацца з выкладчыкам.

Наступным важным этапам з'яўляецца засваенне навучэнцамі новай тэрміналагічнай лексікі. Асноўным сродкам на дадзеным этапе выступаюць спецыяльна падабраныя лексічныя практыкаванні: падбор слоў да прапанаваных дэфініцый, падстаноўка ў тэкст прапушчаных слоў, завяршэнне незакончаных сказаў і пабудова новых з выкарыстаннем прапанаваных тэрмінаў і інш. Сумесная праца навучэнцаў пры выкананні заданняў прадугледжвае ўзаеманавучанне і ўзаемаправерку, дае магчымасці сумеснага абмеркавання, параўнання падрыхтаваных адказаў на зададзеныя пытанні альбо сітуацыі.

Мэта апошняга этапу засваення тэрміналагічнай лексікі — гэта выкарыстанне тэрмінаў у працэсе камунікацыі. Гэты этап з'яўляецца самым складаным, бо патрабуе ад навучэнцаў змястоўна, правільна, лагічна і паслядоўна выражаць свае думкі, свабодна выкарыстоўваючы раней назапашаны моўны матэрыял.

Найбольш эфектыўнымі пры вывучэнні тэрміналогіі будуць такія віды работы, як аналіз тэксту (адказ на пытанні па тэксце, абмеркаванне і каменціраванне тэксту з выкарыстаннем вывучанай лексікі, пераказ, дапаўненне тэкстаў дадатковай інфармацыяй і інш.), абмеркаванне прафесійных тэм, штучнае стварэнне маўленчых сітуацый, інтэрв'ю, апытванні і г. д. Усе гэтыя віды заданняў могуць быць выкарыстаны пры кааператыўным навучанні, яны не толькі

развіваюць маўленне, але і актывізуюць пазнавальную дзейнасць, фарміруюць навыкі лагічнага мыслення навучэнцаў, выпрацоўваюць навыкі сумеснай працы.

Важным відам працы па засваенні тэрміналагічнай лексікі з’яўляецца пераклад прафесійных тэкстаў. Ён садзейнічае папаўненню слоўнікавага запасу навучэнцаў, удасканаленню ведаў, развіццю вуснага і пісьмовага маўлення. Пры выкананні такога задання можна выкарыстаць яшчэ адзін метад кааператыўнага навучання — «вучымся разам». Сутнасць яго заключаецца ў тым, што кожная малая група атрымлівае адно заданне, якое з’яўляецца часткай агульнага задання, над якім працуе ўся навучальная група. У выніку сумеснай работы малых груп дасягаецца выкананне агульнага задання. У якасці такога задання пры вывучэнні тэрмінаў прапануецца тэкст, які разбіваецца на абзацы. Кожная група павінна перакласці асобны абзац. Па завяршэнні дадзенай работы сумесна перакладзены тэкст неабходна пераказаць.

Завяршальным этапам кааператыўнага навучання з'яўляецца этап рэфлексіі і ацэнкі працы. Для ацэнкі сумеснай працы і выстаўлення адзнакі групе выкладчык можа ўзяць на праверку любую работу і па ёй ацаніць усю групу. Акрамя гэтага, можна суміраваць групавую ацэнку з індывідуальнай. Аднак у такім выпадку ўсім навучэнцам напрыканцы заняткаў неабходна прапанаваць выканаць кантрольны тэст, які пакажа ступень індывідуальнага засваення разгледжанай тэмы.

Такім чынам, як паказвае практыка, методыка кааператыўнага навучання мае шмат станоўчых элементаў (сумесная дзейнасць па рашэнні агульных задач, развіццё здольнасці да зносін з іншымі членамі каманды, крытычнае стаўленне да выказвання іншых, развіццё творчага мыслення і інш.), якія актыўна выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе, а таксама ляжаць у аснове самых розных канцэпцый і тэхналогій: праблемнага навучання, педагогікі супрацоўніцтва, праектнай тэхналогіі і інш.

1. Образовательный стандарт высшего образования (ОСВО 1-93 01 03-2021) [Электронный ресурс] // Государственный комитет по стандартизации Республики Беларусь. URL: https://gosstandart.gov.by (дата обращения: 18.03.2023). Перейти к источнику Вернуться к статье

2. Симхович В. А. Кооперативное обучение как форма коммуникации в вузе // Русский язык как средство коммуникации в современном интернациональном пространстве : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 26–27 нояб. 2015 г. / Респ. ин-т высш. шк. ; редкол.: Я. С. Яскевич (гл. ред.) [и др.]. Минск, 2015. С. 216–218. Вернуться к статье

3. Жолтикова Н. В. Обучение в сотрудничестве на уроках английского языка как средство формирования коммуникативной компетенции. [Электронный ресурс] // Концепт : науч.-метод. электрон. журн. URL: http://e-koncept.ru/2014/14052.htm (дата обращения: 18.03.2023). Перейти к источнику Вернуться к статье

4. Реутова Е. А. Применение активных и интерактивных методов обучения в образовательном процессе вуза : метод. рекомендации. Новосибирск : НГАУ, 2012. С. 28–33. Вернуться к статье

A. M. Shubadziorava

**The use of forms of cooperative learning in the study of the discipline «Belarusian language (professional vocabulary)»**

The article analyzes the features of cooperative learning, the principles and forms of joint work are considered, examples of the application of this technology in practice are given. It is noted that cooperative forms of education contribute to an increase in the educational and cognitive activity of students, develop speech, communication and mental activity.